У АДПАВЕДНАСЦІ з пастановай СНК ад 5 лістапада 1934 года ў Віцебску быў адкрыт медыцынскі інстытут. Нялёгкімі былі першыя гады яго арганізацыі і станаўлення. Сваіх вучэбных карпусоў не было, і заняткі праводзіліся ў зменным у вячэрнюю змену на базе ветэрынарнага інстытута. Вялікую дапамогу ў камплектаванні інстытута навукова-педагагічнымі кадрамі аказаў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут. На пасаду рэктара быў прызначан прафесар М. А. Хазанаў, прарэктарам па навуковай і вучэбнай рабоце — прафесар Г. А. Фешчанка, загадчыкамі кафедраў — прафесары І. Т. Цітоў, М. Ц. Пятроў, В. О. Марзон, І. І. Багдановіч і іншыя.

Партыйныя і савецкія органы горада праявілі вялікія клопаты аб умацаванні матэрыяльнай базы інстытута. Ужо ў 1937 годзе яму быў прадастаўлен чатырохпавярховы будынак па вул. Суворава. У гэтым корпусе размясціліся за малым выключэннем усе тэарэтычныя кафедры. Яны пачалі аснашчацца вучэбным інвентаром, апаратурай для навукова-даследчай работы. За даваенны перыяд было падрыхтавана 808 урачоў, абаронены 4 доктарскія і 12 кандыдацкіх дысертацый.

Ішлі гады. Інстытут рос, развіваўся. Аднак вераломны напад фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз і часовая акупацыя Беларусі спынілі яго дзейнасць. Большая частка выкладчыкаў і студэнты-выпускнікі пайшлі на фронт. У радах Савецкай Арміі, у партызанскіх атрадах і падполлі яны дапамагалі біць ворага, аднаўлялі здароўе параненых і хворых байцоў і афіцэраў. У ліку франтавікоў былі асістэнт кафедры агульнай хірургіі, вядучы хірург палявога перасовачнага шпіталя Аляксандр Якаўлевіч Мітрошчанка, які пасля заканчэння вайны абараніў кандыдацкую дысертацыю і ўжо дацэнтам узначальваў кафедру агульнай хірургіі, а затым быў прарэктарам па вучэбнай рабоце. Удзел у баях на франтах Вялікай Айчыннай вайны прымалі асістэнт кафедры факультэтскай тэрапіі Я. М. Зельдзін, выпускнікі браты Канстанцін і Мікалай Арсеньевы, А. Ф. Катовіч, В. С. Серада і іншыя.

Шмат карысных спраў зрабіў былы загадчык кафедры судовай медыцыны дацэнт М. Л. Мурашка. Знаходзячыся ў акупіраваным Віцебску, ён праз сувязных падполля забяспечваў медыкаментамі і перавязачным матэрыялам партызанскія атрады Віцебшчыны. У партызанскіх атрадах неслі медыцынскую службу выпускнікі Г. Я. Цемахаў, І. У. Грынькоў, Д. А. Тарнаповіч і многія іншыя.

Пяць гадоў інстытут не працаваў. І вось у 1946 годзе па хадайніцтву мясцовых партыйных і савецкіх органаў было прынята рашэнне аб аднаўленні ў Віцебску медыцынскага інстытута.

# БУЙНЫ ВУЧЭ

На руінах ствараўся інстытут нанава. Яго другое нараджэнне было не менш цяжкім, чым першае. І зноў партыйныя і савецкія органы прадастаўлялі памяшканні для вучэбных карпусоў, інтэрнатаў, адміністрацыйных службаў, гаспадарчых патрэб.

У гэтыя цяжкія гады аднаўлення многа сіл і энергіі прыклалі рэктар інстытута прафесар І. І. Багдановіч, былая загадчыца абласнога аддзела аховы здароўя М. У. Дзянісава, загадчыкі кафедраў заслужаны дзеяч навукі БССР прафесар Г. А. Мядзведзева, заслужаны дзеяч навукі прафесар Н. В. Вінаградаў, заслужаныя дзеячы навукі прафесары М. М. Янчур, У. М. Велічэнка, член-карэспандэнт АМН СССР прафесар В. С. Шапот, дэкан лячэбнага факультэта прафесар Е. С. Кетыладзе, дацэнт А. Я. Мітрошчанка, прафесар І. А. Франкфурт, прафесар Б. К. Маркіянаў, дацэнт В. М. Шкі-

рэнка, прафесар А. М. Дзямецкі і многія іншыя.

З 1961 года інстытут атрымаў права прымаць да абароны кандыдацкія дысертацыі. Актыўна вядзецца падрыхтоўка аспірантаў. З 1966 года ў ліку 10 навучальных устаноў краіны інстытут стаў падпарадкоўвацца Міністэрству аховы здароўя СССР.

Сёння інстытут — буйны вучэбны цэнтр па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных маладых спецыялістаў. Ён адным з першых у краіне перайшоў на новую, больш прагрэсіўную форму падрыхтоўкі ўрачоў з аднагадовай спецыялізацыяй і інтэрнатурай.

За гады свайго існавання інстытут падрыхтаваў каля 8 тысяч маладых спецыялістаў — урачоў і правізараў. Нашы выхаванцы стаяць

# ЭБНЫ ЦЭНТР

на варце людскога здароўя ў Беларусі, у многіх аддаленых кутках Краіны Саветаў, у радах Савецкай Арміі, на сельскіх урачэбных участках. Сярод нашых выпускнікоў ёсць выдатныя арганізатары аховы здароўя, таленавітыя вучоныя. Гэта намеснік міністра аховы здароўя БССР К. М. Анішчанка, былы рэктар нашага інстытута прафесар Г. А. Мядзведзева, рэктар Гродзенскага медыцынскага інстытута прафесар Д. А. Маслакоў, загадчыкі кафедраў прафесары У. М. Велічэнка, Л. І. Багдановіч, М. Ф. Лызікаў, А. А. Кірпічэнка. Сёння толькі ў інстытуце на пасадах загадчыкаў кафедраў 15 выхаванцаў нашай ВНУ. Выкладчыцкі састаў лячэбнага факультэта на 82 працэнты ўкамплектаван выпускнікамі інстытута.

Мы ганарымся нашымі выпускнікамі, якія многа сіл і энергіі аддаюць ахове здароўя сельскага насельніцтва. Больш дзесяці гадоў самааддана працуе на Старасельскім урачэбным участку Л. Ц. Дзянісава. Яна здабыла любоў і павагу насельніцтва, сваіх пацыентаў. Любоў Цімафееўна неаднаразова выбіраецца дэпутатам абласнога Савета. Яна карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод тых, каму служыць па загаду сэрца, па прызванню.

Значных поспехаў інстытут дабіўся ў падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў. На 45 кафедрах інстытута працуюць 252 выкладчыкі. Сярод іх 21 доктар і 148 кандыдатаў навук. Удзельная вага выкладчыкаў, якія маюць вучоную ступень, складае 67 працэнтаў. Гэта высокі працэнт!

Усяго за гады існавання інстытут падрыхтаваў 35 педагогаў вышэйшай кваліфікацыі, у тым ліку за 4 гады дзевятай пяцігодкі — 14. Кандыдатаў навук падрыхтавана 212 чалавек.

У інстытуце 16 кафедраў, на якіх усе выкладчыкі маюць вучоную ступень. Гэта кафедры шпітальнай, факультэцкай і агульнай хірургіі, траўматалогіі і артапедыі, мікрабіялогіі, патанатоміі, біяхіміі і рад іншых.

Студэнты забяспечаны добра абсталяванымі, упарадкаванымі інтэрнатамі. Да іх паслуг светлыя, прасторныя аўдыторыі, актавая зала, лабараторыі, бібліятэка, сталовыя і г. д.

У адказ на клопаты аб сабе яны адказваюць добрай паспяховасцю. У нас паспяховасць студэнтаў складае 95 працэнтаў, а па грамадскіх навуках — 100 працэнтаў.

У інстытута добрыя перспектывы. Плануецца на 1976 год пачатак будаўніцтва новага вучэбнага корпуса, на 1978 год — новага інтэрната на 1080 месц. Да канца дзесятай пяцігодкі плануецца павялічыць удвая прыём на фармацэўтычны факультэт.

Перспектывы радуюць і абавязваюць кіраўніцтва інстытута, партыйную, прафсаюзную, камсамольскую арганізацыі рабіць усё, каб са сцен нашай навучальнай установы выходзілі высокакваліфікаваныя спецыялісты, сапраўдныя змагары за здароўе чалавека.

**Я. МЯДЗВЕДСКІ,**
**рэктар інстытута, дацэнт.**